па дзве капы. А калі ёсць грошы, то плоцяць грашамі замест гусі, курэй, аўса. Атрымліваецца не больш».

Таким образом, «Пабудова двара Маркаўскага» – это важный исторический источник по истории Беларуси периода Великого Княжества Литовского (ВКЛ), Ошмянского и Вилейского уездов Виленской губернии, «малой Родны» тех, кто родился и вырос на территории бывшего Марковского староства.


1. Барыс, С. В. Нарачанка і яе берагі / С. В. Барыс, А. В. Рогач. – Мінск : Зміцер Колас, 2013. – 712 с.

2. Бохан, Ю. М. Мястэчкі і працэсы ўрбанізацыі на землях Беларусі ў XV–XVIII стст. / Ю. М. Бохан [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2020. – 292 с.

3. Космач, В. А. Талуи: история деревни, ее жителей и окрестностей / В. А. Космач. – Витебск : ВГУ имени П.М. Машерова, 2022. – 344 с.

4. Маркава // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Т. 5 / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (галоўны рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1999. – С. 74.

5. Пабудова двара Маркаўскага // Библиотека Варшавского университета (Польша). Отдел рукописей. 1616 год. № 336. – 41 с.



**Доўнар А.Б.**


## КРЫНІЦЫ ПА ГАНДЛІ ЛЯСНЫМІ ТАВАРАМІ Ў 30-я ГАДЫ XVII ст. (НА ПРЫКЛАДЗЕ МАЁНТКА ПАСТАВЫ)


*Ключавыя словы: крыніцы, гандаль, лясныя тавары, 30-я гг. XVII ст., Паставы.*


Гандаль ляснымі таварамі ў часы Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ) меў важнае значэнне ў структуры знежняга гандлю. Асноўныя накірункі, асаблівасці, дынаміку гандлю ляснымі таварамі ў ВКЛ у агульных рысах разгледзіў у сваёй манаграфіі О. Гедэман [3]. У дадзеным артыкуле мы разгледзім на прыкладзе маёнтка Паставы 30-х гг. XVII ст. крыніцы па гандлі ляснымі таварамі.

У пачатку XVI ст. Паставамі валодаў Юрый Іванавіч Зяновіч (памер 1517 г.), пасля яго смерці – яго сыны: Мікалай, Міхаіл, Юрый і Ян. Кожны з сыноў атрымаў сваю частку маёнтка. І ў кожнай частцы Пастаў пэўны час была свая гісторыя. У 30-я гг. XVII ст. адной часткай Пастаў валодала дачка Крыштафа Зяновіча Ганна Сафія, якая ў 1628 г. выйшла замуж за Альбрэхта Уладзіслава Радзівіла. У 1637 г. яна падаравала сваю частку Пастаў Юрыя Яну Юр’евічу Зяновічу [1, с. 54–55].

У другой трэці XVII ст. маёнтак Паставы дынамічна развіваўся. Гаспадарка Пастаў мела трывалыя сувязі з рознымі рэгіёнамі краіны: Вільняй, Нясвіжам, Навагрудкам, Віцебскам, Полацкам, Дзіснай і інш., а ў знешнеэканмічных стасунках з Рыгай.

Гаспадарчае жыццё радзівілаўскага маёнтка Паставы ў перашай палове 30-х гг. XVII ст. была звязана з Аляксандрам Вацлавам Младзецкім (у большасці выпадкаў у дакументах гаспадарчага справаводства ён называўся як Аляксандр, і значна радзей як Вацлаў [2, арк. 49] ці Аляксандр Вацлаў [2, арк. 47 адв.]). Паміж А. У. Радзівілам і А. Младзецкім за першую палову 30-х гг. XVII ст. адносна маёнтка Паставы і гандлю ляснымі таварамі накапілася шмат ўзаемных прэтэнзій. Іх разгляд адбываўся пасля другой палову 1635 г., ужо пасля смерці бакоў. У сувязі з чым у Архіве Радзівілаў захаваліся дакументы бягучага справаводства адносна гаспадарчай дзейнасці А. Младзецкага, найперш адносна гандлю ляснымі таварамі з маёнтку Паставы.

Найперш захаваўся *кантракт* ад 23 ліпеня 1631 г. паміж А. У. Радзівілам з А. Младзецкім на выраб лясных тавараў ў пушчах маёнткаў Паставы і Полава (адзін кантракт быў складзены ад імя А. У. Радзівіла, а другі ад імя А. Младзецкага). Згодна кантракту А. Младзецкі абавязваўся вырабіць лясныя тавары за свой кошт (прадугледжвалася ўкладванне Младзецкім на дадзеную работу сумы ў 600 коп літоўскіх грошаў): попел, поташ, шмальцуг (смалу), дубовыя дошкі, клёпку, ванчос,

балкі, мачты і інш. да вясны 1632 г. і прадставіць Радзівілу. Радзівіл павінен быў купіць дадзеныя лясныя тавары па рыначнаму кошту, «каб нікому не было шкоды». Пры канчатковым разліку ўлічвалася і вышэйзгаданая сума ў 600 коп грошаў, якая варочалася Младзецкаму пры продажу тых лясных тавараў. Згодна кантракту Младзецкі меў права, у выпадку вытворчай неабходнасці, браць у радзівілаўскіх маёнтках Паставы і Полава прадукты харчавання (збожжа, «пітво»). З названых маёнткаў павінны былі пастаўляцца яму падводы для вывазу лясных тавараў з лесу і іх дастаўкі да партовых рэк для наступнага сплаву. Па дамове Младзецкі меў права жыць у двары Полава і мець на сябе ардынацыю (грашовае і харчовае ўтрыманне/узнагароджанне) [1, с. 75; 2, арк. 5–5 адв. (копія), 7–7 адв. (арыгінал), 9–9 адв. (кантракт ад імя А. Младзецкага)]. А. Младзецкі аставаўся адказным за выраб і продаж лясных тавараў з маёнтка Паставы некалькі год.

А. Младзецкі, з’яўляючыся і пастаўскім наместнікам і радзівілаўскім фактарам, павінен быў даваць асобныя справаздачы аб гаспадарчай дзейнасці пастаўскага маёнтка і дзейнасці па нарыхтоўцы і продажу лясных тавараў дадзенага маёнтка. Так, 23 ліпеня 1635 г. А. У. Радзівіл, знаходзячыся ў Смаргоні, засведчыў, што ён падчас свайго знаходжання ў Паставах ўзяў у А. Младзецкага на свае розныя «патрэбы і расходы» 97 зл і 21 польскіх грошаў. Пры чым спецыяльна падкрэслівалася, што квітанцыя аб атрыманні дадзеных грошаў улічвалася не падчас справаздачы з пастаўскага маёнтка, а падчас справаздачы даходаў і расходаў за лясныя тавары [2, арк. 49].

Дакументы сведчаць, што ўтрыманне А. Младзецкаму як адказнаму за выраб лясных тавараў ішло з даходаў Пастаўскага маёнтка. Так, у 1631 г. пастаўскі і полаўскі наместнік Радзівіла Багушэвіч перадаў Младзецкаму 1435 зл і розных прадуктаў харчавання:

– 44,5 бочак жыта: 30 па ардынацыі, а за 14,5 бочак, якія даваліся рамеснікам за работу ў лесе па 3 капы грошаў літоўскіх, што ў суме за 14,5 бочак раўнялася 108 зл 22,5 гр; акрамя гэтага, калі Багушэвіча не было, то яго наместнік Валадкевіч выдаў з Пастаў 6 бочак жыта па 100 грошаў літоўскіх = 25 зл;

– яркі 11,5 бочак: 8 па ардынацыі, а за 3,5 па дзве капы за бочкі = 17 зл 15 гр;

– за два полця саланіны, якія выдаў наместнік Багушэвіч – 6 зл 20 гр;

– за 10 гусей, па 8 гр літоўскіх= 3 зл 10 гр;

– за 15 курэй па 3 гр літоўскіх = 1 зл 26 зл 2 пенязі;

– за 6 парасят па 6 гр літоўскіх = 1 зл 15 гр;

– 45 яек – 7 грошы і 2 пенязі польскіх (цэны прадуктаў разлічваліся па цэнах на торзе ў Вільні ў гэты час).

Усяго з маёнтка Паставы ў 1631 г. А. Младзецкі атрымаў грошаў і прадуктаў на агульную сумму 1599 зл 26 грошаў і 2 пенязі [2, арк. 14].

А. Младзецкі вёў ўлік атрыманых сум і прадуктаў, а таксама запісваў у асобны *рэестр іх расходванне*. У 1631 г. ён адзначыў, што слуга Радзівіла Гараін узяў у яго ў Жуховічах на патрэбы князя, для «переезда старой пані Пуцілоўскай 20 зл; як і было выдадзена іншаму радзівілаўскаму слузе Крышылоўскаму на справу у Вільні 56 зл. Акрамя гэтага ў артыкулах расходаў А. Младзецкага за 1631 г. былі пазначаны

– 10 зл «на работу» радзівілаўскаму слузе Кандратовічу, які быў пасланы князям да Полава «агледзець лясы, ці ёсць што згоднага да вырабу» лясных тавараў;

– 11 зл на дарогу Младзецкаму да Полава (паездка была неабходна для арганізацыі «пачатку лясной работы» на месцы);

– 8 зл. было дадзена слузе Младзецкага для паездкі ў Віцебск і Полацк, для найма на працу буднікаў і пільнікаў;

– 70 зл былі патрачаны на 9 новых піл для пілення досак і 2 напільнікі;

– 470 зл 26,5 гр было выдадзена нясвіжскім пільнікам за выраб 16 коп і 30 шт досак (за капу па 11 коп літоўскіх грошаў + па асьміне ячменю (па 22,5 гр літ, па 5 кварт солі (па 3 гр польскіх) [2, арк. 14–14 адв.].

Даходы, атрыманыя ад гандлю ляснымі таварамі з Пастаў, забяспечвалі не толькі Радзівіла грашовымі сродкамі, але яны ішлі і на пакрыццё затрат на выраб лясных тавараў. Так, 24 кастрычніка 1634 г. А. У. Радзівіл, знаходзячыся ў Нясвіжы, сваім квітом засведчыў, што пастаўскі і полаўскі наместнік А. Младзецкі перадаў яму «на патрэбы і расходы» 400 польскіх злотых, якія былі атрыманы «за прададзены попел» [2, арк. 50]. А 25 красавіка 1633 г. радзівілаўскі слуга Самуэль Струбіч выдаў квітанцыю, што ён узяў у А. Младзецкага з сумы грошаў за сплаў лясных тавараў з Пастаў і Полава 600 зл для выплаты заробнам ляснікам Радзівіла [2, арк. 26].

Квітанцыя аб «лясных» таварах, расходванні даходаў ад іх продажу раскрываюць разнастайныя бакі гаспадарчай дзейнасці. Так, 24 кастрычніка(?)[1] 1634 г. А. У. Радзівіл, знаходзячыся ў Міры, сваім квітом засведчыў, што А. Младзецкі прывёз і аддаў чатырох рысяў, якія былі забітыя ў Пастаўскай пушчы; чатырох выдр, 22 вэндленых шчупакоў (звычайна, вэндлілі шчупакоў вялікіх памераў), 23 вэндленых вялікіх язяў, тры капы невялікіх шчупакоў, ляшчоў, язяў, двух самоў, 25 рабчыкаў, поўкорца кміну, салянку водных арэхаў [2, арк. 42].

8 мая 1632 г. Цімафей Касабуцкі, слуга Аляксандра Младзецкага, фактара троцкага кашталяна князя Радзівіла, выдаў даведку, што сплавіў на двух платах 14 коп і 50 штук дубовых досак. А пасля сам Младзецкі прыехаў у Рыгу і прадаў тыя доскі 24 чэрвеня 1632 г. Генрыху Жыбену па 50 польскіх грошаў за доску. Што атрымалася за капу досак 100 зл, а за ўсе, без ліку выбракаваных 20 досак, – 1483 зл 10 гр. За тыя тавары Младзецкі ўзяў у Рызе, часткова соллю, 34 беркаўцы солі [2, арк. 13].

Неабходна адзначыць, што ажыцяўляўся пастаянны кантроль нарыхтоўкі і продажу лясных тавараў. Так, 12 верасня 1632 г. слуга А. Младзецкага Генрых Сіберы, які відаць дастаўляў попел у Рыгу, дакладваў свайму пану, што яму паставілі на двух стругах 11 лаштаў «буды» (попелу), «неспадзявана вельмі благой якасці». Пасля «адбракавання» было падсумавана, што на першым стругу знаходзілася тавару на 2 лашты і 2 бочкі добрай якасці («пад лапай»), 3 лашты і 3 бочкі браку, у якіх ішло пры падліку паўтары бочкі браковага тавару як адна добрага – што давала пры падліку добрага тавара 2 лашты і 2 бочкі: агулам пры продажу добрага попелу з першай стругі можна было прадаць 4 лашты і 4 бочкі. У другім стругу знаходзілася попелу добрай якасці адзін лашт і восем бочак, бракованага попелу было 31 бочка, у якіх ішло пры падліку паўтары бочкі бракованага тавару як адна добрага – што давала пры падліку добрага тавара – адзін лашт і 8,5 бочак; у 14 бочак знаходзіўся вельмі бракованы попел, якія пры падліку лічыліся як две бочкі за адну – што давала пры продажу кошт сямі бочак. У суме на другім стругу знаходзілася попелу з разліку продажу як добрай якасці: 8 лаштаў и 3,5 бочак і две бочкі на карысць А. Младзецкага. Сіберту ўдалося прадаць лашт попелу па 60 зл, ён жа прасіў, каб яму прысылалі больш якасны попел з буд, які б можна было б прадаваць за 100 зл. Нізкаякасны попел прыводзіў да «крыўды ў торгу», г.зн. не прыносіў чакаемага прыбытку. У дадзеным выпадку за 8 лаштаў і 3,5 бочкі было атрымана па 60 зл, што ў суме склала 497 зл зл 15 гр. Дадзеныя грошы былі перададзены ўпаўнаважаным Радзівіла: шляхцічу Касабуцкаму для «маладцоў» (матросаў рачных суднаў) – 6 зл, Загорскаму і яго слузе Чыжэўскаму 122 зл, Грыгору Шышлу – астатнія 369 зл і 15 гр [2, арк. 11].

18 красавіка 1635 г., знаходзячыся ў Смаргоні, А.У. Радзівіл паведаміў А. Младзецкаму, што даручыў пастаўскаму мешчаніну Тэадору Кроліку быць галоўным па сплаву платамі да Рыгі лясных тавараў з Пастаўскага маёнтка. У сувязі з чым

[1] Назва месяца схавана пад пячаткай якой быў засведчаны дакумент

Младзецкаму было загадана забяспечыць Т. Кроліка ўсім неабходным для сплава («у дарогу па звычаю і патрэбе») і перадаць яму ў нагляд («дазор») «і заведванне, як усе тавары, якія накіроўваліся да Рыгі, так і кормнікаў і чэлядзь, каб яму ва ўсім, так як яму самому падпарадкоўваліся». Младзецкі павінен быў накіраваць разам з Т. Кролікам яшчэ двух здольных пастаўскіх мяшчан, якіх бы Кролік сам выбраў для дадзенай працы, выдзяліць ім човен, каб усе тыя спрытней дабраліся да месца знаходжання лясных тавараў і хутчэй даставілі іх да Рыгі. Распараджэнні Т. Кроліку даваў непасрэдна А. У. Радзівіл [2, арк. 70].

Але не ўсё ў гаспадарчай дзейнасці Пастаў ішло належным чынам. Так, па паперах асабістай перапіскі А. Радзівіла з А. Младзецкім у лісце ад 1 сакавіка 1631(?) г. Радзівіл здзіўляўся, што з Пастаўскай і Полаўскай воласці не даваліся падводы для вывазу лясных тавараў на бераг – «пакуль трывае санная дарога» [2, арк. 87].

Аб злоўжываннях пры нарыхтоўцы лясных тавараў сведчаць скаргі на Младзецкага падданых Пастаўскага маёнтка. Адна з такіх скарг была пададзена А. У. Радзівілу ў Смаргоні 19 сакавіка 1635 г.: пастаўскія і полаўскія падданыя скардзіліся на полаўскіх ляснічых Гестара і Стахоўскага, што тыя спусташалі пушчы і вырабілі вялікай клёпкі па 1 тыс зл, а меншай на 3 тыс.зл; спецыяльна, з умыслу спілілі і спалілі 90 дубоў, прыгодных для вырабу борцяў, а з пчоламі было знішчана 10 дубоў, пры чым павыбіралі мёд з воскам. Падданыя скардзіліся на буднікаў двух буд, што тыя свавольна вырубалі ліпу. Ад чаго сялянам была шкода, так як найлепшы мёд атрымоўваўся менавіта з ліп, як і з ліпы атрымоўваўся якасны попел (за тое быў пакараны ляснічы Нестар – яго прыгаварылі да біцця пастронкамі. Ляснічых Младзецкага абвінавачвалі ў «выдранні» (знішчэнні) двух дворных борцяў з пчоламі, а пасля «п’янымі буднікамі» яшчэ 10 дворных вулляў [2, арк. 95].

У цэлым, дакументы адносна гандлю ляснымі таварамі 30-х гг. XVII ст. з маёнтка Паставы прадстаўлены разнастайнымі крыніцамі: дамовамі аб працы, квітанцыямі аб атрыманні грошаў, тавараў з маёнткаў, паперамі асабістай перапіскі, рэестрамі даходаў і расходаў, скаргамі падданых на лясных рабочых і інш. Дадзеныя крыніцы аднаго маёнтка даюць ўяўленне пра правілы і механізмы арганізацыі працы па вырабу і гандлю ляснымі таварамі, пра ход дадзеных работ, схемы расходвання сродкаў, атрыманых ад дадзенага гандлю.

1. Памяць : гіст.-дакум. хроніка Пастаўскага раёна. – Мінск : БЕЛТА, 2001. – 688 с.
2. Нацыянальны гістарычны архіў. – Ф. 694. Воп. 4. Спр. 2026.
3. Hedemann, O. Dawne puszcze i wody / O. Hedemann. – Wilno : Księgarnia św. Wojciecha, 1934 – 187 s.

**Субоцін А.А.**

## КЛІМАТЫЧНЫЯ З’ЯВЫ XVII ст. НА ТЭРЫТОРЫІ ВКЛ ВА “УСПАМІНАХ” АЛЬБРЭХТА СТАНІСЛАВА РАДЗІВІЛА

*Driven Ключавыя словы: ВКЛ, клімат, надвор’е, гістарычная кліматалогія, мемуарная літаратура.*

Пры рэканструкцыі клімату мінулых стагоддзяў, калі адсутнічалі інструментальныя метэаралагічныя даследаванні, асаблівую каштоўнасць маюць такія пісьмовыя крыніцы, як дзённікі і мемуары, якія дазваляюць ахарактарызаць стан надвор’я па ўласных назіраннях іх аўтараў. Яскравым прыкладам мемуарнай літаратуры Рэчы Паспалітай XVII ст. выступае твор “Успаміны пра падзеі ў Польшчы”, запісаны канцлерам вялікім літоўскім Альбрэхтам Станіславам Радзівілам. “Успаміны” ўяўляюць сабой дзённікавыя запісы, зробленыя ў прамежак часу з 1632 г. да 1656 г., дзе